# ЛЕНІНСКАГА ВУЧЭННЯ

Вялікія перспектывы ў вырашэнні Харчовай праграмы адкрываюцца перад геннай інжынерыяй, а таксама біятэхналогіяй, дзе вытворчыя працэсы адбываюцца не ў апаратах, а ў жывой клетцы.

Вучоныя нашай краіны бачаць свой абавязак перад Камуністычнай партыяй, перад савецкім народам у паспяховым ажыццяўленні рашэнняў майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС.

**В. ХІЛЬКЕВІЧ,**
**кандыдат біялагічных навук, в. а. дацэнта кафедры батанікі і фізіялогіі раслін.**

## ФІЗІКА І НАВУКОВА-ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС

**У эпоху, якую мы жывём, вялікае значэнне набывае філасофскі аналіз праблем навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, выбар правільных светапоглядавых арыенціраў. Бліскучыя прыклады такога аналізу даюць нам працы У. І. Леніна. І цяпер мы карыстаемся ленінскай метадалогіяй, тымі абагульненнямі і вывадамі, якія зроблены Уладзімірам Ільічом з аналізу развіцця прыродазнаўства ў перыяд крутой ломкі асноўных паняццяў і ўяўленняў.**

У нашай краіне дасягненням навукі ўдзяляецца шмат увагі. Гэта звязана з той першаступеннай роллю, якую Камуністычная партыя адводзіць навуцы як важнейшаму фактару сацыяльнага і эканамічнага працэсу. Сярод названых у дакументах XXVI з'езда КПСС важнейшых навуковых праблем, на якіх павінна быць сканцэнтравана ўвага, нямала звязаных з поспехамі тэарэтычнай і эксперыментальнай фізікі. Тут і класічныя цяпер галіны, такія, як фізіка элементарных часцінак і атамная фізіка, фізіка цвёрдага цела і оптыка, квантавая электроніка і радыёфізіка, а таксама галіны, якія развіваюцца непасрэдна на аснове фізічных даследаванняў. Гэта — ядзерная энергетыка, пераўтварэнне і перадача энергіі, мікраэлектроніка, вылічальная тэхніка і многае іншае.

Нельга не адзначыць тых поспехаў, якіх дасягнула квантавая электроніка. Лазерны прамень цяпер плавіць і зварвае метал, рэжа, сверліць, загартоўвае паверхню. Дзейнічаючы магутным імпульсам лазернага выпраменьвання, можна расплавіць самы тонкі паверхневы пласт, пры зацвярдзенні якога ўтвараецца аморфная плёнка. Такая паверхня ўстойлівая да карозіі. Цяпер зараджаецца лазерная апрацоўчая прамысловасць, якая ў многіх выпадках паспяхова канкурыруе з алмазнай апрацоўкай матэрыялаў. Прымяненне лазераў у спектраскапіі дазволіла ўзняць іх адчувальнасць да такой ступені, што магчыма выявіць самую нязначную колькасць рэчыва, канкурыруючы ў гэтых адносінах з легендарнай здольнасцю сабакі адрозніваць пахі. Такія прыборы знойдуць разнастайнае прымяненне, напрыклад, пры пошуку нафты і газу. З дапамогай лазераў можна раздзяляць ізатопы.

**А. КАЧАМІН,**
**кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі.**

## МАТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЕДАЎ — ВАЖНЕЙШАЯ АСАБЛІВАСЦЬ СУЧАСНАЙ НАВУКІ

**Пранікненне матэматыкі ў** іншыя галіны навуковых ведаў стала ў апошнія дзесяцігоддзі асабліва шырокім і імклівым. Пры гэтым размова ідзе не аб простых вылічальных або вымяральных аперацыях, але аб параўнаўча складаным апараце матэматыкі, які сам па сабе нярэдка ствараецца ў ходзе гэтага пранікнення.

Паняцце матэматызацыі навуковага ведання і з'ўляецца адлюстраваннем названага працэсу, усё пашыраемага выкарыстання матэматычных метадаў у навуцы. Гісторыя навукі сведчыць, што пашырэнне вобласці прымянення матэматычных метадаў і звязаных з імі матэматычных мадэляў, г. зн. матэматызацыя навукі, ёсць неад'емная асаблівасць развіцця навукі. Яна не з'яўляецца чымсці новым, спецыфічным, узнікшым толькі ў наш час.

Галоўным стымулам матэматызацыі з'яўляюцца практычныя патрэбнасці грамадства, якія з неабходнасцю вядуць развіццё навук, у тым ліку тых, у якіх вывучаюцца колькасныя характарыстыкі аб'ектаў і звестак сапраўднага свету.

Ступень матэматызацыі, яе ўзровень вызначаецца, па-першае, тым, наколькі дапускае фармалізацыю сістэма паняццяў дадзенай навукі, ці дастаткова яна развітая для гэтага, а, па-другое, тым, наколькі сама матэматыка развіла свае метады і тэхнічныя сродкі, каб некаторая іх сукупнасць магла быць дастатковай для пабудовы мадэляў, патрабуемых на дадзеным этапе развіцця навукі.

Калі разглядаць пытанне аб матэматызацыі навуковага ведання з самых агульных філасофскіх пазіцый, дык яно акажацца не чым іншым як адной з сувязей узаемадзеянічанняў матэматыкі і іншых навук, яе ўдзелу ў агульным працэсе развіцця навукі.

Ленінская пастаноўка пытання не толькі вызначае значэнне і ролю матэматызацыі навуковых ведаў. Ва У. І. Леніна мы знаходзім далейшае развіццё праблемы правільнай пастаноўкі асноўнага пытання філасофіі прымяняльна да матэматыкі, што дае правільную арыенціроўку ў своеасаблівым працэсе матэматычнай працы.

**Л. ПАЛЯКОЎ,**
**кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт.**

## НАВУКОВЫЯ РЭВАЛЮЦЫІ І ЗМЯНЕННЕ СТЫЛЮ МЫСЛЕННЯ

У цяперашні час у многаразовай ступені ўяўленні аб свеце пашырыліся і паглыбіліся, што прыводзіць да далейшага змянення стылю мыслення ў бок сістэмнага, рацыянальнага, інтэнсіўнага. Сучасная эпоха з яе глыбіннымі міжнароднымі, сацыяльнымі, навукова-тэхнічнымі, экалагічнымі, дэмаграфічнымі і іншымі праблемамі патрабуе менавіта такога стылю мыслення.

Патрабаваннем жыцця ва ўмовах сталага сацыялізму становіцца работнік «інтэнсіўнага» тыпу, канцэнтраваным выражэннем якога з'яўляецца, відавочна, як адзначалася на XXVI з'ездзе КПСС, рэалістычны, эканамічны стыль мыслення. У сучасных умовах, калі на першы план выступае якасны бок справы, важнае значэнне набывае пераадоленне сілы інерцыі, характэрнай для экстэнсіўнага мыслення і дзеяння, развіццё крытычна-аналітычнага, комплекснага, а таксама перспектыўнага стылю мыслення і на яго аснове дзеяння.

У. І. Ленін пісаў, што рэвалюцыя ёсць такое пераўтварэнне, якое ламае старое ў самым асноўным і карэнным. Тут падкрэслены два бакі рэвалюцыі: стваральная і разбуральная.

Зацвярджэнне сучаснага інтэнсіўнага, рэалістычнага, эканамічнага стылю мыслення і паступовае пераадоленне экстэнсіўнага, інерцыйнага як раз і сведчаць аб наяўнасці двух бакоў рэвалюцыі — стваральнай і разбуральнай, у сэнсе, як пісаў У. І. Ленін, прамой і поўнай ломкі старога для замены яго новым. (У. І. Ленін. ПЗС, т. 44, с. 222).

**Такім чынам, ленінскія творы, у тым ліку «Аб значэнні ваяўнічага матэрыялізму», выступаюць метадалагічнай асновай аналізу навуковых рэвалюцый і змянення стылю мыслення.**

**У. КАЛМЫКОЎ,**
**доктар філасофскіх навук, прафесар, загадчык кафедры філасофіі.**



## У ЛАБАРАТОРЫЯХ УНІВЕРСІТЭТА

**У бягучай пяцігодцы ў нашым універсітэце створана праблемная навукова-даследчая лабараторыя фізіка-хімічных працэсаў трэння. Аб'ём выконваемых тут работ няўхільна павялічваецца.**

**НА ЗДЫМКАХ: (злева) — малодшы навуковы супрацоўнік А. А. ШАЛУДЗЯКОВА, чацвёртакурснік фізічнага факультэта І. БАНАДЫСЕЎ і дацэнт В. Р. ПІНЧУК даследуюць дыслакацыйную структуру металаў пры трэнні; (справа) — пад кіраўніцтвам загадчыка лабараторыі У. М. СТАРЫКАВА (ў цэнтры) праводзяцца рэнтгена-структурныя даследаванні паверхняў трэння.**

Фота **К. Дзмітэркі.**



*Інтэрнат — твой дом*

# СВЯТА СТУДЭНТАЎ

З бягучага навучальнага года ўсе студэнты матэматычнага факультэта жывуць у інтэрнаце № 2. Гэта акалічнасць у значнай ступені садзейнічае таму, што выбраны нядаўна студсавет адразу ж уключыўся ў работу. Наладжана дзяжурства на паверхах, вырашан шэраг пытанняў, якія датычацца быту і адпачынку студэнтаў. Да свята Вялікага Кастрычніка выйшаў першы нумар інтэрнацкай насценгазеты.

Цікавае мерапрыемства праведзена ў інтэрнаце на мінулым тыдні. Яно прысвячалася Міжнароднаму дню студэнтаў. Для падрыхтоўкі святочнага вечара шмат давялося папрацаваць усяму саставу студсавета і асабліва адказнай за культурна-масавы сектар Ірыне Марчанка.

Праграма вечара была даволі разнастайнай. У холе пятага паверха з'явіўся спецыяльны выпуск насценнай газеты.

На свой вечар студэнты-матэматыкі запрасілі сяброў з фізічнага, геалагічнага факультэтаў і факультэта фізвыхавання. Уступным словам вечар адкрыла старшыня студсавета, студэнтка чацвёртага курса Вера Эрліх. Яна павіншавала ўсіх са святам студэнтаў.

Затым пачаўся першы тыраж жартоўнай латарэі. Розыгрыш кожнага прыза (а іх было каля ста) суправаджаўся дасціпнымі жартамі, загадкамі, афарызмамі. Вялікае задавальненне і гасцям, і гаспадарам свята даставілі вясёлыя вядучыя Ала Цымбал, Вольга Дашкевіч і Ларыса Ларысава.

Заключная частка свята — дыскатэка. Яна таксама была вельмі цікавай і захапляльнай. Яе праграму, у якую ўвайшлі музычныя творы лепшых савецкіх і замежных аўтараў і выканаўцаў, склаў Алег Яўстраценка.

Вечар прайшоў, як кажуць, на адным дыханні. Немалаважную ролю ў яго поспеху адыграла тое, што студсавет падышоў да справы не фармальна, а з душой, прыцягнуў да падрыхтоўкі святочнага вечара вялікую колькасць энтузіястаў культурнага адпачынку.

Асабліва хочацца адзначыць узорны парадак, які падтрымліваўся на працягу ўсяго вечара групай рабят на на чале з Мікалаем Шкутам.

**С. БАДРУНОЎ,**
**старшы куратар інтэрната № 2.**

